УДК 821.161.3.09

# ЭКЗІСТЭНЦЫЙНЫЯ ПОШУКІ ПАЭЗІІ ІРЫНЫ БАГДАНОВІЧ

**І. І. Шматкова**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*E-mail: i.shmatkova@gmail.com*

У артыкуле разглядаюцца экзістэнцыйныя пошукі ў лірычнай творчасці беларускай паэтэсы Ірыны Багдановіч, аналізуецца ідэйна-эстэтычная і мастацкая адметнасць яе лірыкі, вызначаецца роля творчасці І. Багдановіч у сучаснай беларускай літаратуры.

*Ключавыя словы:* Ірына Багдановіч; экзістэнцыйныя пошукі; паэзія; лірычная гераіня; вобраз; ідэйна-эстэтычны змест; жаноцкасць; эвалюцыя творчасці.

Ірына Эрнстаўна Багдановіч – выдатная беларуская паэтэса, перакладчыца, літаратуразнаўца. Яе пранікнёная лірычная споведзь, грунтоўныя навуковыя даследаванні і крапатлівыя пераклады сталі адметнай з’явай ў айчынным літаратурным  мастацтве.

Экзістэнцыйныя пошукі сталі адметнай рысай яе творчасці, пачынаючы з першага зборніка “Чаравікі маленства” (1985). У санаце “Ідзе

чалавек…” для вырашэння спрадвечнага пытання аб сэнсе чалавечага існавання аўтарка абірае не вельмі часта выкарыстоўваемую ў беларускай паэзіі музычную форму, якая будуецца цыклічна і складаецца з чатырох частак пэўнай паслядоўнасці з кантрастным тэмпам гучання: у І. Багдановіч гэта andante, allegro, presto, final. У першай частцы санаты ва ўмерана павольным тоне аўтарка задаецца пытаннем: *“Што прынясу я ў дзень свой судны?”* [6, с. 27], урачыста-адказны настрой моманту ўзмацняецца рэфрэнам, які суправадждае кожную з чатырох частак твора: *“Ідзе чалавек. // Балючыя крокі // не па траве — // па цвіках эпохі”* [6, с. 27]. У другой частцы разам з паскарэннем тэмпу паглыбляецца змест твору і вырастае напружанасць яго канфлікту праз дыялог аб душы чалавека: *“Голас: // што ты? — // Ціхі голас: ну што ты?. // Пустата і абвал адзіноты. // Толькі шэпат застаўся // адчайны: // — Ну што ты?.. // Потым — смех // над стаптаным абуткам // са слова Душа. // — Душа? — запытаўся. // — Душа! // — А нашто табе трэба душа — // атавізм, ненармальнасць у час энтээр // і прагрэсу?..”* [6, с. 30], — аўтарка да музычных жанравых характарыстык твору дадае моўны гукапіс і алітэрацыю – нанізванне аднатыпных гукаў у словах “што ты”, “шэпт”, “душа”, “пустата” і г. д., якія пранізваюць да глыбіні той самай душы. Трэцяя частка, якая патрабуе самага хуткага тэмпу, звяртае ўвагу чытачоў да тых вобразаў шчаслівага дзяцінства, якімі І. Багдановіч нездарма насычае сваю першую кніжку: *“лялька”, “малпа з чырвонага футра”, “пластмасавы кубачак ляльчын”, “гумавы мячык”.* І нарэшце, фінал-прысуд аб розных выніках зямнога жыцця чалавека: *“Адзін пасадзіць сад // або пабудуе палац для дзяцей. // Другі каменне // пакіне ад гмаху // і пыл — // ад камення. // Супадзенне? // Адзін выціскае гарачыя сляды розуму // на паперы. // Другі ўладна стукае ў дзверы // сусвету, // каб далі яму на жыхарства // не кватэру — усю планету. // Адзін лечыць раны хваробнага веку. // Другі на свет прыбаўляе калекаў…”* [6, с. 32]. Дзеля чаго існуе чалавек на гэтай зямлі, які след ён аставіць пасля сябе, – адказнасць аўтаркі за сваё жыццё, за жыццё ўсяго чалавецтва перад наступнымі пакаленнямі, акрэсленая на пачатку творчасці з кожным зборнікам толькі паглыбляецца.

Асноўным лейтматывам паэтычнай кнігі І. Багдановіч “Фрэскі” (1989), які надае адзінства вершам і паэмам не толькі гэтага зборніка, але і звязвае яго з папярэднім і наступнымі, стала думка аб тым, што каб выжыць, чалавецтву трэба зберагчы перш за ўсё духоўнасць, якую нам завяшчалі продкі. Паэтэса метафарычна сцвярджае, што глядзяць продкі на нас “вачамі фрэсак” (верш “Галасы фрэсак”).

Трэцяя паэтычная кніга І. Багдановіч "Вялікдзень" убачыла свет у 1993 г. У зборніку аўтарка па-ранейшаму працягвае барацьбу за духоўнасць чалавека, але ў гэты раз яна змяняе "зброю" – стараецца ад духоўнай "летаргіі" прабудзіць Бацькаўшчыну "літургіяй". У кнізе прадстаўлены шырокі пласт духоўна-рэлігійных твораў, з'яўляецца непасрэдна жанр малітвы (вершы "Суціш мяне, о Госпадзе, суціш…", "Госпадзе, душу маю крані…" і інш.). У сваіх духоўных пошуках паэтэса ўсё часцей адчувае сябе "часовай госцяй" на гэтай зямлі: *"Госцяй часовай прайсьці па зямлі, // Каб не параніць Нябёсаў"* [1, с. 20], ужываючы гэту метафару ў некалькіх творах неаднаразова (вершы "Сыпле і падае белы наліў…", "Час апалых лістоў і пялёсткаў…"). Лірычная гераіня пачынае разумець *"тоеснасць шляху // даСканаласць і Скон"* (верш "Лабірынт") [1, с. 14]. Упершыню ў гэтым зборніку паэтэса звяртаецца да жанру свабоднага верша (верлібра), які будзе багата прадстаўлены ў наступных паэтычных кнігах І. Багдановіч.

У 2004 г. выходзіць з друку "Сармацкі Альбом" І. Багдановіч. На старонках зборніка вершаў ажывае сармацка-рыцарская гісторыя Вялікага княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, – часоў, калі спавядаліся ідэалы вольнасці, веры і кахання, панаваў культ Айчыны. Увогуле, азначаныя прынцыпы сармацкай культуры сталі блізкімі экзістэнцыйнаму светабачанню І. Багдановіч. Любоў да Радзімы, вера, свабода – вядучыя вобразы паэзіі аўтаркі.

Азначаныя ў ранейшых кнігах духоўныя прыярытэты лірыкі І. Багдановіч знайшлі працяг і ў яе зборніку вершаў і перакладаў "Душа лістападу" (2012). У першым раздзеле зборніка "Кірмаш трубадураў" лірычная гераіня, выступаючы ў ролі таго самага трубадура, прадстаўляе чытачу сваю творчасць як адну з экзістэнцыйных катэгорый для творцы, яе "трубадур" знаходзіцца ў пошуках свабоды, пагэтаму і форму верша абірае свабодную – верлібр – *"прыемна хаатычны // як сын свабоды // арыстакратычны"* (верш "Развага трубадура") [2, с. 15], па-выкладчыцку раскладвае раздзел на 2 часткі – тэорыю верлібра і хрэстаматыю верлібра.

Вядучым вобразам кнігі ў гэты раз становіцца "светамір", які мае ў творах паэтэсы шматграннае экзістэнцыйнае ўвасабленне: у першым раздзеле зборніка і ў аднаіменным вершы "Кірмаш трубадураў" гэта, у першую чаргу, свет яе паэзіі, які аўтарка нібы выстаўляе на продаж: *"Выстаўлю тут самаробны // свой светамір…"* [2, с. 5]; у вершы "рыса" светамір перакуліўся, глядзіць закаханымі вачыма, і таму ствараецца малюнак *"перакуленага светамірнага бляску"* [2, с. 9]; у аднаіменным верлібры светамір абдорвае лірычную гераіню пацалун-

кам, піша на целе даланёю *“кахаю”*, і нарэшце паэтка адкрывае сапраўднае імя светаміру: *“як каханак ночы // як гаспадар дню // як спакуснік спакою // як цярэбнік цярпенняў // як нахабнік натхнення // як настаўнік настрою // як пан майго лёсу…”* [2, с. 13].

Паэтэса, як і многія іншвя беларускія паэтэсы [7, с. 77], неаднаразова задаецца экзістэнцыйнымі пошукамі: што значыць паэзія ў жыцці аўтаркі, якое прызначэнне ў паэта на зямлі? У аўтабіяграфіі, напісанай яшчэ ў красавіку 2000 г. аўтарка ўзгадвае пра цудоўны стан натхнення: калі яно прыходзіць, *“я дзякую Богу за ласку спазнання творчага экстазу, “выпадзення” з рэальнасці, адлёту ў тыя блакітныя вяршыні-глыбіні, дзе толькі і магу адчуваць сябе па-сапраўднаму шчаслівай, самадастатковай, дзе адкрываюцца сувязі часоў і прастораў, вертыкаляў і гарызанталяў, быту і нябыту, дзе крышку прыадчыняецца змройлівае покрыва над спрадвечнай таямніцай універсальнай Ісціны Быцця”* [3, с. 348 – 349]. У кнізе вершаў “Душа лістападу” паэзія таксама надзяляецца ўсемагутнай жыццясцвярджальнай сілай: *“Ты як зерне пяску, // у якім кропля дажджу // прарастае травінкай…”* [2, с. 64], а наканаванне паэта – *“Не наракаць, // не чыніць прысудаў, // проста дзякаваць за Жыццё! // Проста прагаварыць // свой лёс – // вершамі…”* [2, с. 56].

У раздзеле “Вінагроздзя кахання”, у супрацьвагу традыцыйнаму разуменню вобразаў віна і кахання як сімвалаў чалавечай зямной жарсці, І. Багдановіч рэпрэзентуе іх як вобразы нябёсныя – сімвалы жыцця, крыві, адзінага правільнага шляху, ісціны, Боскай ласкі. Паранейшаму, у многіх творах паэтэсы заўважаем “прысутнасць Боскай пячаткі”, якая дапамагае лірычнай гераіні прайсці праз усе наканаванні лёсу: *“Крыж цяжкі прыцісне плечы… // Але ж ён і твой ратунак…”* [2, с. 67], – і не проста прайсці, але яшчэ і быць удзячнай: *“Табе, Найвышэйшы Божа, // Мая замалая ўдзячнасць…”* [2, с. 65]. Пахрысціянску аўтарка гартуе цярпенне і стойкасць, хаця і ёсць наракання на жаночую долю, што традыцыйна і для іншых беларускіх паэтэс-жанчын: *“А смачна ж есці // ежу са слязьмі // жаночай долі, // звітай у цярпенне…”* [2, с. 25], але ў І. Багдановіч усё пераадольваецца моцным характарам – у вершы “Жывом і будам!” гучыць не скарга, не туга на *“лёсу гаспадарку”,* а толькі *“буду і магу!”* [2, с. 34].

Арыенціры духоўных пошукаў лірычнай гераіні – жыць у адпаведнасці з Боскімі запаветамі і ўсведамляць, што межы дасканаласці недасягальны: *“Штодня // рушыш // у свой шлях // дасканаласці. // Хочаш быць // добрым і справядлівым, // міласэрным // і споўненым любові. // Трэба змірыцца з тым, // што заўсёды знойдзецца // прычына // для пакаяння”* [2, с. 53].

Такім чынам, экзістэнцыйны “светамір” лірыкі Ірыны Багдановіч – гэта паэтычны роздум пра сутнасць чалавечага жыцця і ролі ў ім творчасці, аб тых духоўных арыенцірах, якія задаюць нябёсны вектар зямному існаванню, аб незгасальных патрыятычных ідэалах, што асвячаюць сувязь чалавека з роднай зямлёй і яе гісторыяй.

БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ

1. Багдановіч, І. Вялікдзень: вершы / Ірына Багдановіч. – Менск: Беларуская Каталіцкая Грамада, 1993. – 62 с.
2. Багдановіч, І. Душа лістападу: вершы, пераклады / Ірына Багдановіч. – Мінск: Кнігазбор, 2012. – 100 с.
3. Багдановіч, І. Залатая Горка: вершы, пераклады, атрыкулы / Ірына Багдановіч. – Мінск: Кнігазбор, 2016. – 400 с.
4. Багдановіч, І. Сармацкі Альбом: зб. вершаў / Ірына Багдановіч. – Мінск: Ursus, 2004. – 84 с.
5. Багдановіч, І. Фрэскі: вершы і паэмы / Ірына Багдановіч. – Мінск: Маст. літ., 1989. – 118 с.
6. Багдановіч, І. Чаравікі маленства: вершы / Ірына Багдановіч. – Мінск: Маст. літ., 1985. – 62 с.
7. Шматкова, І.І. Чалавек – паэт – грамадства ў беларускай жаночай паэзіі другой паловы XX стагоддзя / І.І. Шматкова // Социальные, политические и культурные процессы на территории Центральной и Восточной Европы в исторической перспективе: материалы II Международной научной конференции, Пинск, 24 – 25 ноября 2017 г. / Полесский государственный университет. – Пинск, 2017. – С. 75 – 78. – [Электронный ресурс]. – Рэжым доступу: https://www.elibrary.ru/download/elibrary_30651191_63563516.pdf – Дата звароту: 27.02.2021.

## EXISTENTIONAL SEARCHES FOR THE POETRY OF IRYNA BAGDANOVICH

**I.I. Shmatkova**
*Belarusian State University, Minsk, Belarus*
*E-mail: i.shmatkova@gmail.com*

The article examines the existential search in the lyrical works of the Belarusian poetess Iryna Bagdanovich, analyzes the ideological, aesthetic and artistic identity of her lyrics, determines the role of the works of I. Bagdanovich in modern Belarusian literature.

*Keywords:* Iryna Bagdanovich; existential searches; poetry; lyrical heroine, image; ideological and aesthetic content; femininity; evolution of creativity.